Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
________________ А. А. Корбут
________________ 2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ____ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АСНОВЫ КІРАВАННЯ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ УЛАСНАСЦЮ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках);*
*1- 23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

2017

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках), адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках), рэгістрацыйныя нумары Е 23-1-45/14 вуч., Е 23-1-46 /14 вуч., Е 23-1-47 /14 вуч. ад 24.02.2014 г., па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), рэгістрацыйныя нумары Е-23-1-25/13 вуч., Е-23-1-26/13 вуч. ад 14.10.2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*В. А. Касап,* загадчык кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Р. А. Ровіна,* прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*Н. І. Сафронава,* загадчык аддзела патэнтных дакументаў дзяржаўнай установы «Рэспубліканская навукова-тэхнічная бібліятэка»

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 21.10.2016);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 08.12.2016)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: В. А. Касап

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны абумоўлена прыняццем пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31.07.2003 г. № 1016 і ад 12.07.2004 г. № 843, у адпаведнасці з якімі ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных вучэбных установах краіны была ўведзена вучэбная дысцыпліна «Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю».

У перыяд развіцця краіны па інавацыйным шляху ахова створаных інтэлектуальных аб’ектаў з’яўляецца пачатковай умовай іх рэалізацыі. Многія творчыя праекты беларускіх аўтараў надзейна ахоўваюцца сістэмай аўтарскага права. Інавацыйныя прапановы арганізацый, распрацоўшчыкаў і вучоных атрымліваюць патэнтную ахову. Сучасныя бібліятэкі і музеі, з аднаго боку, захоўваюць і выкарыстоўваюць творы, на якія распаўсюджваецца прававая ахова, а з іншага – самі з’яўляюцца стваральнікамі творчых аб’ектаў, якія падлягаюць ахове.

Вучэбная дысцыпліна «Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю» цесна звязана з дысцыплінамі агульнапрафесійнага і спецыяльнага цыклаў: «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і менеджмент», «Менеджмент і маркетынг у музейнай дзейнасці», «Эканоміка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці» і інш.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – пашырэнне ведаў студэнтаў аб аб’ектах інтэлектуальнай уласнасці, якія ахоўваюцца па законе, аб інфраструктуры сістэмы інтэлектуальнай уласнасці ў Беларусі, аб дзейнасці бібліятэк і музеяў у кантэксце законаў аб ахове інтэлектуальнай уласнасці, а таксама фарміраванне ўменняў, звязаных з інфармацыйнымі аспектамі забеспячэння аховы і выкарыстання аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці.

Дасягненне гэтай мэты рэалізуецца праз вырашэнне *задач*:

– фарміраванне ведаў аб аб’ектах інтэлектуальнай уласнасці, іх ахове і метадыцы выкарыстання ў бібліятэках і музеях з улікам асаблівасцей фарміравання фондаў, абслугоўвання карыстальнікаў і арганізацыі экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці;

– засваенне ведаў аб прававой ахове аб’ектаў аўтарскага права і рэалізацыі правоў аўтараў у бібліятэках і музеях;

– авалоданне сучаснымі метадамі патэнтна-інфармацыйнага пошуку і правядзення патэнтных даследаванняў з улікам выкарыстання розных відаў патэнтна-інфармацыйных рэсурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый адпаведна з адукацыйнымі стандартамі вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках):

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі;

АК-4. Умець працаваць самастойна;

АК-5. Быць здольным параджаць ідэі (валодаць крэатыўнасцю);

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем;

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі;

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця;

АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай, навукова-даследчай дзейнасці ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў;

ПК-4. Весці інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне розных груп карыстальнікаў;

ПК-7. Фарміраваць інфармацыйную культуру карыстальнікаў;

ПК-13. Аказваць кансалтынгавую дапамогу па разнастайных кірунках бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;

ПК-14. Распрацоўваць метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі, арганізацыйна-тэхналагічную дакументацыю;

ПК-23. Укараняць прынцыпы інавацыйнага менеджменту і сістэмы менеджменту якасці ў работу бібліятэкі;

ПК-35. Праводзіць метадычны маніторынг і метадычныя даследаванні ў бібліятэках розных тыпаў і відаў;

ПК- 37. Арганізоўваць і суправаджаць павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па спецыяльнасці 1-23 01-12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках):

САК-6. Умець працаваць у камандзе;

САК-7. Умець фарміраваць і адстойваць уласную думку;

ПК-1. Планаваць, арганізоўваць і ўдасканальваць дзейнасць службаў кіравання музейнай справай, аховы гісторыка-культурнай спадчыны, адукацыі і турызму;

ПК-2. Планаваць, арганізоўваць і весці менеджарскую, маркетынгавую, фінансавую і пасрэдніцкую працу;

ПК-6. Умець фармуляваць задачы па праектаванні, эксплуатацыі і ўдасканальванні (у частцы інфармацыйнага забеспячэння) стацыянарных музейных экспазіцый, выстаў і турыстычных маршрутаў;

ПК-14. Планаваць, арганізоўваць і весці навукова-метадычную і вучэбна-метадычную работу;

ПК-15. Праводзіць кансультаванне па пытаннях музейнай справы, арганізацыі турызму і аховы гісторыка-культурнай спадчыны;

ПК-16. Ажыццяўляць пошук, сістэматызацыю і аналіз інфармацыі па перспектывах развіцця галіны, інавацыйных тэхналогіях, праектах і рашэннях;

ПК-17. Вызначаць мэты інавацый і спосабы іх дасягнення;

ПК-18. Працаваць з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай;

ПК-19. Ацэньваць канкурэнтаздольнасць і эканамічную эфектыўнасць музейных тэхналогій, якія распрацоўваюцца;

ПК-20. Прымяняць метады аналізу і арганізацыі ўкаранення інавацый;

ПК-21. Складаць дамовы сумеснай дзейнасці па асваенні новых тэхналогій;

ПК-22. Рыхтаваць праекты ліцэнзійных пагадненняў аб перадачы правоў на выкарыстанне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– асноўныя паняцці і тэрміны ў сферы інтэлектуальнай уласнасці;

– асноўныя палажэнні міжнароднага і нацыянальнага заканадаўства аб інтэлектуальнай уласнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– парадак афармлення і абароны правоў на аб’екты інтэлектуальнай уласнасці;
– віды дагавораў на перадачу правоў валодання інтэлектуальнай уласнасцю;
– інфармацыйныя працэсы пошуку і распаўсюджвання патэнтнай інфармацыі;

*умець*:
– скласці аўтарскі дагавор на перадачу правоў на выкарыстанне на адзін з аб’ектаў аўтарскага права;
– заіндэксаваць тэматычны запрос з выкарыстаннем адной з міжнародных класіфікацый на аб’екты прамысловай уласнасці;
– правесці тэматычны, імянны, нумарацыйны патэнтны пошук з выкарыстаннем традыцыйных і электронных інфармацыйных рэсурсаў;
– скласці рэгламент пошуку для правядзення патэнтных даследаванняў з рознымі мэтамі;
– аказаць кансультацыйную дапамогу пры афармленні заявачных дакументаў на выдачу ахоўных дакументаў на аб’екты прамысловай уласнасці;

*валодаць:*
– методыкай правядзення патэнтнага пошуку;
– навыкамі складання ліцэнзійных дагавораў на перадачу правоў на выкарыстанне твораў;
– навыкамі інфармацыйнага забеспячэння патэнтных даследаванняў.

Для павышэння эфектыўнасці вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю» рэкамендуецца выкарыстоўваць праблемнае і модульнае навучанне. Для эфектыўнасці кіравання і арганізацыі вучэбнага працэсу – індывідуалізацыю навучання, метад практыка-арыентаванага навучання, тэхналогію вучэбна-даследчай дзейнасці і інш.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю» адведзена 68 гадзін, з якіх 34 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 28 гадзін, семінарскія заняткі – 6 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Уводзіны*

Роля інтэлектуальнай уласнасці ў інтэнсіфікацыі развіцця грамадства, паляпшэнні канкурэнтаздольнасці выпускаемай прадукцыі, міжнародным супрацоўніцтве, ахове твораў літаратуры і мастацтва.

Мэта, задачы і структура вучэбнай дысцыпліны «Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю». Кампетэнцыі, якія набываюць студэнты падчас яе вывучэння. Методыка вывучэння вучэбнай дысцыпліны і яе інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне. Сувязь з іншымі дысцыплінамі агульнанавуковага і агульнапрафесійнага цыклаў. Асаблівасці самастойнай работы над асобнымі тэмамі. Формы кантролю ведаў студэнтаў.

*Тэма 1. Агульнае ўяўленне*
*аб інтэлектуальнай уласнасці*

Узнікненне інтэлектуальнай уласнасці. Паняцце «інтэлектуальная ўласнасць». Веды як аснова інтэлектуальнай уласнасці. Сістэма інтэлектуальнай уласнасці, яе функцыі і ўласцівасці. Агульнаправавыя і галіновыя прынцыпы сістэмы інтэлектуальнай уласнасці.

Азначэнне інтэлектуальнай уласнасці і яе структура. Класіфікацыя аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці. Гістарычныя прыклады развіцця форм інтэлектуальнай уласнасці і яе аховы ў Беларусі.

*Тэма 2. Аб’екты прамысловай уласнасці*
*і іх прававая ахова*

Азначэнне, характарыстыка, формы прававой аховы аб’ектаў прамысловай уласнасці: вынаходстваў, карысных мадэляў, прамысловых узораў, а таксама таварных знакаў, знакаў абслугоўвання, геаграфічных указанняў, селекцыйных дасягненняў, тапалогій інтэгральных мікрасхем, нераскрытай інфармацыі – ноу-хау. Функцыі ахоўных дакументаў: патэнтаў, пасведчанняў і інш. Службовыя аб’екты прамысловай уласнасці.

Патэнтныя законы. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь, накіраванае на ахову аб’ектаў прамысловай уласнасці. Паняцце «патэнтаздольнасць», умовы патэнтаздольнасці аб’ектаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Патэнтаванне аб'ектаў прамысловай уласнасці. Віды і формы патэнтнай экспертызы.

Суб'екты права інтэлектуальнай уласнасці.

*Тэма 3. Дзяржаўнае кіраванне*
*інтэлектуальнай уласнасцю ў Рэспубліцы Беларусь*

Арганізацыя патэнтна-ліцэнзійнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. Інфраструктура сістэмы інтэлектуальнай уласнасці. Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці (НЦІУ): функцыі, структура, напрамкі дзейнасці. Узаемадзеянне з нацыянальнымі патэнтнымі ведамствамі. Роля РНТБ, Беларускага таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў, Беларускай асацыяцыі патэнтных павераных, Судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь і іншых арганізацый у развіцці і ахове інтэлектуальнай уласнасці ў Беларусі. Галіновыя службы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю. Рэгіянальныя інфармацыйна-метадычныя цэнтры. Патэнтныя службы на прадпрыемствах і ва ўстановах. Іх роля і функцыі.

Дынаміка аховы розных аб'ектаў прамысловай уласнасці ў Беларусі.

Рацыяналізатарская дзейнасць на прадпрыемствах і ва ўстановах краіны. Асаблівасці прававой аховы рацыяналізатарскіх прапаноў. Магчымасці афармлення рацыяналізатарскіх прапаноў у сферы культуры.

*Тэма 4. Міжнароднае супрацоўніцтва*
*ў галіне аховы аб'ектаў прамысловай уласнасці*

Роля міжнародных пагадненняў па ахове прамысловай уласнасці ў стварэнні адзінай інфармацыйнай прасторы. Парыжская канвенцыя па ахове прамысловай уласнасці: асноўныя прынцыпы і кірункі яе дзейнасці. Сусветная арганізацыя інтэлектуальнай уласнасці (WIPO): яе задачы і кірункі дзейнасці. Пагадненне аб патэнтнай кааперацыі (PCT), Еўрапейская патэнтная канвенцыя, Еўразійская патэнтная канвенцыя краін СНД і інш. Іх роля і значэнне для развіцця нацыянальных патэнтных сістэм. Уплыў міжнародных пагадненняў на стварэнне міжнародных і рэгіянальных патэнтных дакументаў, на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паляпшэнне абмену патэнтнай інфармацыяй, ажыццяўленне патэнтнага пошуку і патэнтнай экспертызы.

Стандартызацыя патэнтных дакументаў, патрабаванні да паўнаты патэнтных фондаў, глыбіні патэнтнага пошуку пры правядзенні патэнтных даследаванняў як вынік дзейнасці міжнародных пагадненняў па ахове прамысловай уласнасці.

*Тэма 5. Міжнародныя класіфікацыі вынаходстваў, прамысловых узораў, таварных знакаў*

Асноўныя прынцыпы пабудовы класіфікацый аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці. Гісторыя ўзнікнення і развіцця патэнтных класіфікацый у краінах свету.

Міжнародная патэнтная класіфікацыя (IPC). Міжнародныя пагадненні па стварэнні і ўвядзенні МПК. Яе структура, змест, характэрныя рысы. Рэдакцыі МПК. Базавы і пашыраны ўзроўні МПК. Методыка індэксавання дакументаў з дапамогай МПК у ручным і аўтаматызаваным рэжымах. Унутраны і знешні даведачна-пошукавы апарат да МПК. Выкарыстанне МПК у краінах з рознымі формамі патэнтнай экспертызы. Недахопы МПК, шляхі яе ўдасканалення на сучасным этапе. Класіфікацыя вынаходстваў Еўрапейскай патэнтнай арганізацыі (ECLA). Сумесная патэнтная класіфікацыя (CPC).

Міжнародная класіфікацыя прамысловых узораў (МКПУ). Гісторыя ўзнікнення, структура, змест, даведачна-пошукавы апарат, методыка выкарыстання. Рэдакцыі МКПУ. Міжнародная класіфікацыя тавараў і паслуг (МКТП). Гісторыя ўзнікнення. Рэдакцыі МКТП. Яе структура, даведачна-пошукавы апарат, методыка выкарыстання.

Міжнародная класіфікацыя выяўленчых элементаў таварных знакаў (МКВТЗ). Асаблівасці пабудовы. Методыка выкарыстання.

*Тэма 6. Патэнтна-інфармацыйныя рэсурсы*

Спецыфічныя асаблівасці патэнтна-інфармацыйных рэсурсаў. Іх месца ў сістэме інфармацыйных рэсурсаў. Уплыў патэнтнага заканадаўства краін, міжнародных пагадненняў на фарміраванне патэнтна-інфармацыйных рэсурсаў.

Азначэнне паняццяў «патэнтныя дакументы», «патэнтна-асацыяваная літаратура». Вартасці і недахопы патэнтных даку-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ментаў як крыніцы інфармацыі. Віды патэнтных дакументаў. Публікацыі звестак аб зменах у патэнтных дакументах.

Патэнтныя дакументы на вынаходствы. Першасныя і другасныя патэнтныя дакументы. Склад дакументаў да заяўкі на вынаходства. Апублікаваная і неапублікаваная заяўкі. Віды апублікавання апісання вынаходства да патэнта ў залежнасці ад віду патэнтнай экспертызы. Патэнты-аналагі.

Патэнтныя дакументы на карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры, таварныя знакі, селекцыйныя дасягненні, тапалогіі інтэгральных мікрасхем: характар публікацыі, віды.

Рэгіянальныя і міжнародныя патэнтныя дакументы: апісанні вынаходстваў да Еўрапейскай заяўкі і патэнта, міжнародныя заяўкі на вынаходствы, патэнтныя бюлетэні.

Патэнтна-інфармацыйныя выданні Беларусі. Роля Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці ў фарміраванні патэнтна-інфармацыйных рэсурсаў. Патэнтныя бюлетэні на аб’екты прамысловай уласнасці. Іх структура, асаблівасці, пошукавыя магчымасці. Роля РНТБ у падрыхтоўцы тэматычных спісаў літаратуры, бібліяграфічных паказальнікаў літаратуры для забеспячэння патэнтных даследаванняў, даведнікаў па патэнтным фондзе.

Арганізацыя падрыхтоўкі патэнтна-інфармацыйных выданняў у Расіі. Патэнтныя бюлетэні. Іх асаблівасці і структура, пошукавыя магчымасці. Выданне табліц патэнтных класіфікацый, элементаў цэнтралізаванага ДПА, метадычнай літаратуры па патэнтазнаўстве.

Міжнародныя базы і банкі даных: ЕПВ (серыя «Espasenet»), WIPO (Patentscope), ЕАПО (EAPATIS), Дервент, STN International і інш. Патэнтныя дакументы ў галіновых БД (напрыклад, CA-Plus, Agricola). Міжнародныя базы даных таварных знакаў «ROMARIN».

Доступ да патэнтных дакументаў краін свету праз сеткі Internet, STN. Агульнадаступныя і камерцыйныя БД патэнтных дакументаў. Асаблівасці прадстаўлення даных у БД патэнтных дакументаў.

Патэнтныя фонды і даведачна-пошукавы апарат як частка патэнтна-інфармацыйных рэсурсаў. Узроўні патэнтных фондаў і іх састаў. Віды ДПА.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 7. Патэнтны пошук і тэхналогія яго правядзення*

Вызначэнне патэнтнага пошуку. Яго сувязі з інфармацыйным пошукам і спецыфіка. Мэты правядзення патэнтнага пошуку. Патэнтны пошук і патэнтныя даследаванні. Уздзеянне асаблівасцей патэнтнага заканадаўства краін на тэхналогію пошуку патэнтных дакументаў.

Асноўныя віды патэнтнага пошуку: тэматычны, нумарацыйны, імянны. Разнавіднасці патэнтнага пошуку: пошук патэнтаў-аналагаў, дзеючых ахоўных дакументаў і інш. Інструментарый патэнтнага пошуку. Тэхналогія правядзення розных відаў патэнтнага пошуку. Выкарыстанне элементаў цэнтралізаванага і спецыялізаванага ДПА пры правядзенні розных відаў патэнтнага пошуку. Тэхналогія патэнтнага пошуку ў БД Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці, Федэральнага інстытута прамысловай уласнасці Распатэнта і інш.

*Тэма 8. Патэнтныя даследаванні:*
*віды і методыка правядзення*

Азначэнне паняцця «патэнтныя даследаванні». Стандартызацыя патэнтных даследаванняў. Віды патэнтных даследаванняў. Мэты правядзення патэнтных даследаванняў: агульныя і канкрэтныя. Патэнтныя даследаванні і навукова-інфармацыйная дзейнасць, маркетынгавыя даследаванні: агульныя рысы і адрозненне. Сутнасць і спецыфіка патэнтных даследаванняў, іх вынік, накіраванасць. Патэнтныя даследаванні і патэнтна-ліцэнзійная дзейнасць, агульныя рысы і адрозненне.

Агульная методыка правядзення патэнтных даследаванняў. Выканаўцы патэнтных даследаванняў. Этапы правядзення патэнтных даследаванняў. Рэгламент пошуку як праграма ажыццяўлення пошуку патэнтнай і іншай навукова-тэхнічнай інфармацыі. Раздзелы рэгламенту. Правядзенне папярэдняга пошуку інфармацыі, вызначэнне прадмета пошуку інфармацыі (устройства, спосаб, рэчыва). Вызначэнне пераліку краін, па якіх будзе ажыццяўляцца пошук інфармацыі. Глыбіня пошуку інфармацыі. Крыніцы пошуку інфармацыі.

Пошук розных відаў патэнтных дакументаў у залежнасці ад тэматыкі і мэт правядзення патэнтных даследаванняў. Адбор дакументаў. Запаўненне справаздачных табліц па выніках пошуку розных відаў дакументаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сістэматызацыя і аналіз адабраных дакументаў. Групоўка патэнтных дакументаў па відах, заяўніках, тэматыцы, краінах прыярытэту, датах падачы заяўкі, па гадах атрымання ахоўных дакументаў. Сістэматызацыя іншых відаў дакументаў у залежнасці ад мэты правядзення патэнтнага даследавання і тэхнічнага задання.

Аналіз патэнтна-ліцэнзійнай сітуацыі. Структура справаздачы аб патэнтных даследаваннях: тэкставая і фармалізаваная часткі.

### *Тэма 9. Аб'екты аўтарскага права і сумежных правоў і іх ахова ў Рэспубліцы Беларусь*

Аб'екты аўтарскага права і сумежных правоў (літаратурныя, мастацкія, навуковыя творы, камп'ютарныя праграмы, базы даных, музычныя творы і інш.). Прынцыпы і ўмовы ўзнікнення, рэалізацыі і абароны аўтарскіх і сумежных правоў. Патрабаванні да ахоўваздольнасці аб'ектаў. Асаблівасці формы аб'ектаў аўтарскага права. Заканадаўчае афармленне аўтарскага права ў Беларусі. Службовыя аўтарскія творы. Састаўныя і вытворныя творы. Аб'екты, на якія не распаўсюджваецца аўтарскае права. Суб'екты аўтарскага права. Асабовыя немаёмасныя і маёмасныя правы. Тэрмін дзеяння маёмасных правоў. Правамернае выкарыстанне твораў без згоды аўтара.

Аб'екты сумежных правоў: выканаўчая дзейнасць артыстаў, аўдыя- і відэазапісы, фанаграмы, радыё- і тэлевізійныя перадачы і інш. Суб'екты сумежных правоў. Уладальнікі маёмасных сумежных правоў. Тэрмін аховы сумежных правоў.

Кіраванне маёмаснымі правамі аўтараў і ўладальнікаў сумежных правоў на калектыўнай аснове. Аўтарская дамова. Ліцэнзійныя пагадненні па передачы правоў, якія ахоўваюцца па законе. Абарона аўтарскіх правоў. Грамадзянска-прававая і крымінальная адказнасць за парушэнні аўтарскіх і сумежных правоў.

Міжнародныя пагадненні ў галіне аўтарскіх і сумежных правоў і далучэнне да іх Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 10. Бібліятэкі і музеі ў кантэксце Закона «Аб аўтарскім праве і сумежных правах»*

Аўтарскае права і бібліятэчная, музейная дзейнасць. Віды твораў, якія ахоўваюцца. Рэпрадуцыраванне твораў бібліятэчнага захоўвання, фатаграфаванне музейных экспанатаў. Аўтарскае права і Інтэрнэт. Электронныя бібліятэкі і іх дзейнасць у прававым полі. Асаблівасці дзеяння Закона «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» у музеях: суадносіны аўтарскага права і права валодання творам. Фатаграфія як аб'ект аховы аўтарскім правам. Музейная экспазіцыя і прававыя асаблівасці яе аховы.

Сучасны стан і праблемы, звязаныя з рэалізацыяй правоў аўтараў у бібліятэцы і музеі: часовае захаванне, вольны доступ, электронная дастаўка дакументаў, абавязковы экзэмпляр электроннага дакумента і правы аўтараў, выдаўцоў і карыстальнікаў. Прававыя аспекты дзейнасці бібліятэк і музеяў у лічбавым асяроддзі. Вопыт бібліятэк і музеяў свету па выкарыстанні твораў, якія ахоўваюцца па заканадаўстве. Выключэнні і абмежаванні ў заканадаўстве аб аўтарскім праве для бібліятэк і музеяў.

*Тэма 11. Камерцыйнае выкарыстанне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці*

Асноўныя формы перадачы правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці. Класіфікацыя дамоў, іх змест і структура. Ліцэнзійная дамова. Віды ліцэнзій. Рэгістрацыя ліцэнзій.

Камерцыйная выгада ад рэалізацыі аб'ектаў аўтарскіх і сумежных правоў. Стаўкі аўтарскіх ганарараў.

Арганізацыі калектыўнага кіравання маёмаснымі правамі аўтараў. Іх роля і функцыі, сфера дзейнасці. Патрабаванні да іх рэгістрацыі. Размеркаванне атрыманых матэрыяльных сродкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА**
**ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінарскія заняткі | | |
| | Уводзіны | 1 | | | |
| 1. | Агульнае ўяўленне аб інтэлектуальнай уласнасці | 1 | | | тэставае апытанне |
| 2. | Аб’екты прамысловай уласнасці і іх прававая ахова | 2 | | | тэставае апытанне |
| 3. | Дзяржаўнае кіраванне інтэлектуальнай уласнасцю ў Рэспубліцы Беларусь | 1 | | | тэставае апытанне |
| 4. | Міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне аховы аб’ектаў прамысловай уласнасці | 1 | | | тэставае апытанне |
| 5. | Міжнародныя класіфікацыі вынаходстваў, прамысловых узораў, таварных знакаў | 2 | | 2 | распрацоўка вучэбных матэрыялаў |
| 6. | Патэнтна-інфармацыйныя рэсурсы | 2 | 2 | 2 | распрацоўка вучэбных матэрыялаў |
| 7. | Патэнтны пошук і тэхналогія яго правядзення | 2 | | 2 | распрацоўка вучэбных матэрыялаў |
| 8. | Патэнтныя даследаванні: віды і методыка правядзення | 2 | | 2 | распрацоўка вучэбных матэрыялаў |
| 9. | Аб’екты аўтарскага права і сумежных правоў і іх ахова ў Рэспубліцы Беларусь | 3 | 2 | | групавыя абмеркаванні |
| 10. | Бібліятэкі і музеі ў кантэксце Закона «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» | 4 | | | групавыя абмеркаванні |
| 11. | Камерцыйнае выкарыстанне аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці | 1 | | | групавыя абмеркаванні |
| | **Усяго…** | **22** | **4** | **8** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*1.* О патентах на изобретения, полезные модели, промышленные образцы : Закон Респ. Беларусь. – Утв. 16.12.2002 (ред. от 02.08.2010) // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – № 183, 2/1719 от 02.08.2010.

*2.* О патентах на сорта растений : Закон Респ. Беларусь. – Утв. 13.04.1995 г., №3725-XII (ред. 04.01.2010) // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – № 17, 2/1661 от 25.01.2010.

*3.* О товарных знаках и знаках обслуживания : Закон Респ. Беларусь. – Утв. 05.02.1993, № 2181-XII (ред. от 05.01.2016) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pravo.by.

*4.* Об авторском праве и смежных правах : Закон Респ. Беларусь от 17.05.2011 № 262-З [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pravo.by.

*5.* Стратегия Республики Беларусь в сфере интеллектуальной собственности на 2012–2020 гг. : утв. постановлением Совета Министров Респ. Беларусь 2 марта 2012 г. № 205 [Электронный ресурс]. − Режим доступа: http: // www.pravo.by.

*6.* Авторское право в деятельности электронных библиотек : сб. ст. / сост. : Е. А. Данилина, А. М. Цапенко ; под ред. А. М. Цапенко. – М. : ИНИЦ «Патент», 2012. – 119 с.

*7.* Авторское право: библиотеки, издательства и потребители информации в XXI веке : материалы науч.-практ. семинара, Санкт-Петербург, 19–20 нояб. 2013 г. / Рос. науч. б-ка, Рос. библ. ассоц., сост. : Е. И. Борисова, В. В. Мещерякова. – СПб. : Рос. науч. б-ка, 2014. – 148 с.

*8.* Авторское право и библиотеки / Я. Л. Шрайберг, А. И. Земсков, В. В. Терлецкий, В. Р. Фирсов. – М. : ГПНТБ России, 2007. – 48 с.

*9. Беспалый, Ю. Н.* Художественный дизайн музейной экспозиции как объект интеллектуальной собственности /


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ю. Н. Беспалый // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2014. – № 2. – С. 139–144.

*10. Герасимова, Л. К.* Основы управления интеллектуальной собственностью : учеб. пособие / Л. К. Герасимова. – Минск, 2010. – 213 с.

*11. Касап, В. А.* Патентно-информационная деятельность в библиотеке : учеб. пособие / В. А. Касап. – Минск : БГУ культуры и искусств, 2010. – 106 с.

*12. Мальчэўскі, Я.* Станаўленне сістэмы міжнароднай аховы аўтарскага права / Я. Мальчэўскі // Интеллектуальная собственность в Беларуси. – 2010. – № 2. – С. 24–26.

*13.* Проблемы авторского права в деятельности публичных библиотек : информ.-аналит. материал для библиотек / Ленингр. обл. дет. б-ка ; авт.-сост. А. А. Викулин. – СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2004. – 38 с.

*14. Пшибытко, М. Г.* Правовая база использования интернет-технологий в библиотеке / М.Г. Пшибытко // Бібліятэчны свет. – 2010. – № 1. – С. 13–15.

*15. Рудковская, Н.* Произведение науки, литературы и искусства как объект авторского права / Н. Рудковская // Интеллектуальная собственность в Беларуси. – 2014. – № 1. – С. 26–29.

*16. Турлюк, Т.* Компьютерные программы как объект гражданского оборота / Т. Турлюк // Интеллектуальная собственность в Беларуси. – 2013. – № 1. – С. 13–15.

*17. Турлюк, Т.* Секреты производства (ноу-хау) : новое в законодательстве / Т. Турлюк // Интеллектуальная собственность в Беларуси. – 2013. – № 3. – С. 14–17.

*18. Якимахо, А. П.* Управление объектами интеллектуальной собственности / А. П. Якимахо, Г. И. Олехнович. – Минск : ГИУСТ БГУ, 2006. – 335 с.

*19. Ятникова, Е.* Договор об управлении имущественными авторскими правами на коллективной основе / Е. Ятникова // Интеллектуальная собственность в Беларуси. – 2005. – № 4. – С. 28–29.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

*1. Бойкова, О. Ф.* Библиотечная практика и авторское право : науч.-практ. пособие / О. Ф. Бойкова. – М. : Либерея, 2004. – 115 с.

*2.* Возможности комплексного использования классификационных и иных поисковых инструментов : аналитико-тематич. обзор. – М. : ИНИЦ Роспатента, 2003. – 37 с.

*3. Дрешер, Ю. Н.* Организация патентно-лицензионной деятельности и авторское право : учеб.-метод. пособие / Ю. Н. Дрешер. – М. : ФАИР-ПРЕСС, 2003. – 248 с.

*4. Джейнис, П.* Ограничения и исключения в авторском праве, предусмотренные для библиотек и учреждений образования: общемировая востребованность / П. Джейнис // Науч. и техн. б-ки. – 2011. – № 3. – С. 108–114.

*5. Колесников, А. П.* Пособие по работе с официальными патентными бюллетенями / А. П. Колесников. – Изд. 4-е, испр. и доп. – М. : ИНИЦ Роспатента, 2006. – 124 с.

*6. Кудашов, В. И.* Интеллектуальная собственность: охрана и реализация прав, управление : учеб. пособие / В. И. Кудашов. – Минск : БНТУ, 2004. – 322 с.

*7. Лосев, С. С.* Основы управления интеллектуальной собственностью : учеб.-метод. пособие / С. С. Лосев. – Минск : БГЭУ, 2007. – 154 с.

*8. Мельдер, Т. Н.* Ответственность за нарушение авторских прав в Белоруссии / Т. Н. Мельдер // Право интеллектуальной собственности. – 2011. – № 4. – С. 19–20.

*9. Москалевич, Г.* Особенности лицензионного договора на продукт мультимедиа как охраняемый объект интеллектуальной собственности // Интеллектуальная собственность в Беларуси. – 2013. – № 3. – С.18–20.

*10.* Музейные коллекции защищены: зарубежный опыт (по материалам дайджеста российской и зарубежной прессы «Патентное дело») // Интеллектуальная собственность в Беларуси. – 2000. – № 2. – С. 59–63.

*11. Портной, Е.* Защита авторских и смежных прав в Республике Беларусь / Е. Портной // Юрист. – 2007. – № 3. – С. 10–12.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Скорняков, Э. П.* Методические рекомендации по проведению патентных исследований / Э. П. Скорняков, Т. Б. Омарова, О. В. Челышева. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : ИНИЦ Роспатента, 2001. – 196 с.

*13. Смирнова, Н. А.* Авторское право в библиотечном деле / Н. А. Смирнова // Науч. и техн. б-ки. – 2006. – № 2. – С. 49–53.

*14.* Традиционные и новые средства патентного поиска : темат. выпуск. – М. : ИНИЦ Роспатента, 2001. – 76 с.

*15. Федорова, Ю. А.* Основы управления интеллектуальной собственностью : ответы на вопросы к зачету / Ю. А. Федорова, А. В. Иванова. – Минск : Изд-во Гревцова, 2011. – 136 с.

*16. Халецкая, Т. М.* Основы управления интеллектуальной собственностью / Т. М. Халецкая. – 3-е изд., перераб. – Минск : ТетраСистемс, 2012. – 160 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа ажыццяўляецца пры падрыхтоўцы да семінараў, пры выкананні індывідуальных заданняў на правядзенне патэнтнага пошуку ў патэнтна-інфармацыйных рэсурсах розных відаў, распрацоўцы рэгламенту пошуку пры правядзенні патэнтных даследаванняў, а таксама вывучэнні гісторыі развіцця аховы аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці ў Беларусі.

Заданні для самастойнай работы носяць развіццёвы характар і арыентуюць студэнтаў на самастойны пошук інфармацыі ў розных інфармацыйных сістэмах: бібліятэках, рэсурсах Інтэрнэта, розных відах баз даных. Важнае значэнне набывае заданне па індэксаванні аб’ектаў прамысловай уласнасці (выбар ключавых слоў, выкарыстанне спецыялізаваных класіфікацыйных сістэм – Міжнароднай патэнтнай класіфікацыі, Міжнароднай класіфікацыі тавараў і паслуг, Міжнароднай класіфікацыі прамысловых узораў) як першы крок да рацыянальнага патэнтнага пошуку. Вывучэнне нарматыўна-прававых актаў, якія забяспечваюць функцыянаванне аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці, дасць студэнту ўяўленне аб дзеючым заканадаўстве, сістэме патэнтнай экспертызы, тэрмінах і формах аховы аб’ектаў. Распрацоўка праекта ліцэнзійнага пагаднення на перадачу правоў на адзін з аб’ектаў аўтарскага права дапаможа набыць навыкі па рэальным забеспячэнні правоў аўтараў твораў у музеях і бібліятэках. Падрыхтоўка да семінараў дасць магчымасць замацаваць тэарэтычныя веды аб прававым статусе і формах аховы аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Для выяўлення ўзроўню вучэбных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя сродкі дыягностыкі:

– стандартныя заданні па асноўных раздзелах дысцыпліны;
– праблемныя заданні па асноўных тэмах дысцыпліны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– апытанне на семінарах;

– праверка якасці выканання самастойных работ і правядзенне іх абмеркавання;

– выкананне даследчых заданняў (распрацоўка праекта ліцэнзійнай дамовы аб перадачы правоў на адзін з аб’ектаў аўтарскага права);

– падрыхтоўка рэфератаў па гісторыі вынаходніцкай дзейнасці ў Беларусі;

– тэставая праверка ведаў студэнтаў па тэмах дысцыпліны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# АСНОВЫ КІРАВАННЯ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ УЛАСНАСЦЮ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках);*
*1- 23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,22. Ул.-выд. арк. 0,79. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ